УДК 633.82:58.006 (476.4-18)

Т. У. Сачыўка, кандыдат с.-г. навук, дацэнт (БДСГА, г. Горкі);
В. М. Босак, доктар с.-г. навук, прафесар (БДТУ, г. Мінск)

# НОВЫЯ САРТЫ *TRIGONELLA* І *HYSSOPUS* У КАЛЕКЦЫІ БАТАНІЧНАГА САДА БДСГА

Калекцыя вострасмакавых раслін Батанічнага сада і дэндрарыя Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі налічвае 58 відаў (14 сямействаў і 40 родаў).

У апошні час у выніку даследаванняў з калекцыяй вострасмакавых культур выдзелены па комплексу гаспадарча карысных прыкмет і зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэестры сартоў Рэспублікі Беларусь з рэкамендацыяй для вырошчвання ў прысядзібных гаспадарках тры сарты базіліка звычайнага (*Ocimum basilicum* L.) «Магия», «Володар» і «Настена», адзін сорт базіліка танкакветкавага (*Ocimum tenuiflorum* L.) «Источник», адзін сорт цыбулі шмат'яруснай (*Allium*×*proliferum* (*Allium cepa* × *Allium fistulosum*)) «Узгорак», адзін сорт цыбулі духмянай (*Allium odorum* L.) «Водар», адзін сорт барага (*Borago officinalis* L.) «Блакіт» і адзін сорт герані буйнакарэнішчавай (*Geranium macrorrhizum* L.) «Танюша».

У 2016 г. калекцыю вострасмакавых культур Батанічнага саду БДСГА попоўнілі адзін сорт пажытніка блакітнага (*Trigonella caerulea* (L.) Ser.) «Росквіт» і адзін сорт ісопа лекавага (*Hyssopus officinalis* L.) «Завея».

Пажытнік блакітны сорт «Росквіт» – аднагадовая расліна вышынёй 50–80 см. Суквецці шчыльныя, галоўчатыя, шарападобныя; венчык – 5–6 мм, светла-бэзавы. Цвіце пад канец чэрвеня – на пачатку ліпеня, насенне выспявае ў ліпені-жніўні. Сярэднеспелы сорт, вегетацыйны перыяд працягваецца 100–106 дзён. Сярэдняя ўраджайнасць зялёнай масы складае 130–150 ц/га, насення – 6,5–7,0 ц/га. Холадаўстойлівы, непатрабавальны да месц вырошчвання. У ежу ў якасці прыправы ўжываюць насенне пажытніка блакітнага, найчасцей у сумесі з іншымі вострасмакавымі раслінамі.

Ісоп лекавы сорт «Завея» – шматгадовы паўхмызняк вышынёй 50–70 см і дыяметрам 30–60 см. Сцяблíны і лісце – зялёныя, коласападобныя суквецці – белыя. Сярэднеспелы сорт, засухаўстойлівы і холадаўстойлівы; сярэдняя ўраджайнасць зялёнай масы складае 150–155 ц/га. У ежу ў якасці вострай прыправы ўжываюць свежае і сухое лісце, а таксама суквецці, у тым ліку ў сумесі з другімі вострасмакавымі культурамі.